*Н. У. Гермацкая*
(Мінск),
*Л. С. Скакун*
(Мінск)

**Каштоўнасці гродзенскіх музеяў у Дзяржаўным каталогу Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь**

Камп'ютарызацыя музейных фондаў з'яўляецца важным напрамкам работы музеяў. Актыўнае выкарыстанне камп'ютарнай тэхнікі і спецыяльнага праграмнага забеспячэння (ПЗ) у дзейнасці фондаў дае магчымасць спрасціць работу па ўліку і апісанні музейных прадметаў, робіць пошук інфармацыі аб прадметах больш зручным і хуткім. Гэта, у сваю чаргу, спрыяе больш эфектыўнай рэалізацыі навукова-даследчай функцыі музея.

На сёння большасць музеяў Беларусі ўжо пачалі выкарыстоўваць новую версію аўтаматызаванай музейнай сістэмы «Музей-5», распрацаваную НВФ «ІНЕАК». Трэба адзначыць, што гэта ўжо пятая версія спецыялізаванага музейнага праграмнага забеспячэння, распрацаванага і ўкаранёнага ў дзейнасць музеяў Беларусі. Пераход на гэтую версію быў абумоўлены распрацоўкай такога праекта, як Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь (ДКМФРБ), які ўжо на працягу двух гадоў папаўняецца інфармацыяй аб прадметах, якія захоўваюцца ў музеях Рэспублікі Беларусь.

Сярод лідараў укаранення і засваення музейнага праграмнага забеспячэння, а таксама працэсу папаўнення Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь знаходзяцца і музеі Гродзенскай вобласці. У музеях вобласці ўсталявана праграма «Музей-5», і ўсе яны ажыццяўляюць перадачу звестак аб прадметах, што захоўваюцца ў асноўным фондзе музея, у ДКМФРБ.

Адпаведна Палажэнню аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь [1] у ДКМФРБ павінны перадавацца ў першую чаргу прадметы, якія можна аднесці да найбольш каштоўных: зарэгістраваныя ў спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей, унікальныя, рарытэтныя, мемарыяльныя. Рашэнне аб вылучэнні найбольш каштоўных прадметаў прымаецца на фондава-закупачнай камісіі музея, што, у сваю чаргу, стымулюе перагляд асноўнага фонду, а часам дае падставу для ўдакладнення атрыбуцыі прадмета. Да таго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ж звесткі аб прадметах, якія перадаюцца ў Дзяржаўны каталог, павінны ўтрымліваць інфармацыю, якая коратка, але дастаткова поўна апісвае прадмет (для гэтага вылучана 21 асноўнае поле), а таксама фотаздымак для лепшай ідэнтыфікацыі прадмета. У выніку перадача звестак аб прадметах у Дзяржаўны каталог з'яўляецца даволі працяглым працэсам, і на дадзены момант з чатырохмільённага музейнага фонду Рэспублікі Беларусь у ДКМФРБ зарэгістравана менш за 100 000 прадметаў [2]. Гродзенская вобласць па колькасці перададзеных звестак знаходзіцца на другім месцы сярод музеяў рэспубліканскага падпарадкавання.

Калі аналізаваць ужо перададзеныя прадметы, то трэба адзначыць, што музеі вобласці перадаюць амаль усе тыпы прадметаў – рэчавыя, выяўленчыя, пісьмовыя, аўдыявізуальныя і натуральна-гістарычныя. Сярод зарэгістраваных прадметаў найбольшую частку складаюць тыя, што адносяцца да калекцый каштоўных металаў і зброі: манеты, медалі, ордэны розных часоў і краін (ад старажытнасці да сучаснасці), халодная і агнястрэльная зброя. Таксама немалую частку складаюць абразы і прадметы культу розных канфесій, археалагічныя і этнаграфічныя матэрыялы, творы выяўленчага мастацтва, прадметы, якія тычацца міжваеннага перыяду і часоў Вялікай Айчыннай вайны (кнігі, брашуры, газеты, лістоўкі). У Дзяржкаталогу прадстаўлены таксама мемарыяльныя прадметы і тыя, што адлюстроўваюць гісторыю і асаблівасці краю (больш характэрна для раённых музеяў). Такім чынам, ужо на дадзены момант у Дзяржкаталогу можна ўбачыць амаль усе віды прадметаў, якія захоўваюцца ў асноўным фондзе музеяў Гродзенскай вобласці.

Па колькасці перададзеных прадметаў вылучаюцца музеі абласнога падпарадкавання, што дае магчымасць пазнаёміцца з некаторымі цікавымі матэрыяламі, якія там захоўваюцца. Напрыклад, з Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея ў Дзяржаўным каталогу ўжо зарэгістравана больш за 10 000 прадметаў, з якіх вылучаецца калекцыя шкла, прадстаўленая як вырабамі Урэцка-Налібоцкай шкляной мануфактуры (штоф сярэдзіны XVIII ст.) і мануфактуры А.Тызенгаўза (келіхі-ромеры 1770–1780-х гг.), так і посудам, выробленым на акцыянерным таварыстве Ю. Столе «Нёман» (пазней шклозавод «Нёман») у Бярозаўцы Навагрудскага ваяводства.
У Дзяржаўным каталогу прадстаўлена амаль уся наменклатура

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

посуду, які выпускаўся ў 20–30-х гг. XX ст.: флаконы для духоў, вазы, падносы, талеркі, бутэлечкі для воцату, кілішкі, графіны, салатніцы і інш. У сярэдзіне XX ст. таварыства перайменоўваецца ў шклозавод «Нёман» і Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей захоўвае высокамастацкія вырабы першых прафесійных мастакоў шклозавода У. С. Мурахвера і Л. М. Мягковай, а таксама С. Я. Раудвеэ, У. П. Жохава, В. Д. Самахвалава, А. А. Анішчык, Я. С. Гладкова і інш.

Сярод найбольш каштоўных прадметаў вылучаецца таксама калекцыя музычных інструментаў майстра Мар'яна Скрамблевіча з в. Адэльск Гродзенскага раёна, творчасць якога ўключана ў спіс нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

У складзе музейнага збору музея знаходзяцца значныя калекцыі дакументаў і старадрукаў. Фонд старадрукаў і рэдкіх кніг Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея налічвае звыш 23 000 прадметаў і з'яўляецца адным з самых значных у краіне. У Дзяржаўны каталог перададзены рукапісныя кнігі XVIII ст., старадрукі XVII–XVIII стст. Цікавасць уяўляюць дакументы XVI–XVII стст. – позвы і іншыя судовыя справы, прывілеі, выпісы, рэестры. Сярод рукапісаў вылучаюцца запіскі дачкі імператара Аляксандра III вялікай князёўны Вольгі Аляксандраўны да маці імператрыцы Марыі Фёдараўны. Сярод друкаваных выданняў – літаратурны альманах «Journal Literaire» (XVIII ст.), з якім звязваюць узнікненне публіцыстычнага жанру ў Нідэрландах.

Цікавасць уяўляюць этыкеткі папярос «Arystokratyczne», «Roskosz», «Samson», «Literackie» і інш. канца XIX – пачатку XX ст. тытунёвай фабрыкі І.Л.Шарашэўскага ў г. Гродна. Фабрыка, якую заснавалі купцы Л. Шарашэўскі і А. Гардон у 1861 г., з'яўлялася адной з буйнейшых у Расійскай імперыі, яе прадукцыя была вядома ў Еўропе.

У складзе мастацкіх калекцый музея вылучаюцца абразы XVIII – пачатку XX ст., творы сучасных беларускіх мастакоў: Л. Д. Шчамялёва, А. А. Марачкіна, П. В. Масленікава і іншых, сярод графічных твораў: экслібрысы прызнаных графікаў сучаснасці Лембіта Лыхмуса, А. П. Чэпаўскаса, А. І. Калашнікава, В.М.Целеш і інш.

Калекцыя фотадакументаў у Дзяржаўным каталогу прадстаўлена фатаграфіямі Гродна, яго наваколляў, салоннымі фатаграфіямі 1930-х гг. У Дзяржаўным каталогу налічваецца вялікая колькасць фатаграфій 1914–1918 гг. Рамана Салаўя, якія адлюстроўваюць не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькі баявыя дзеяннні падчас Першай сусветнай вайны, але ў большай ступені – будні салдат: баўленне вольнага часу, работу, а таксама фатаграфіі мірных жыхароў – сялян за работай і ў час свят.

Пры дапамозе Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея і Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея імя Е. Р. Раманава супрацоўнікамі Цэнтра Дзяржаўнага каталога была распрацавана метадалагічная база для апісання калекцый натуральна-гістарычных крыніц: класіфікацыя па тыпу, віду, разнавіднасці, слоўнікі матэрыялаў і тэхнік/тэхналогій. Гэта дазволіла музеям перадаваць у Дзяржаўны каталог апісанні прадметаў з натуральна-гістарычных калекцый. У прыватнасці, Гродзенскі гісторыка-археалагічны музей перадаў апісанні разнастайных узораў беларускай флоры, фаўны Беларусі і розных кантынентаў зямлі (Амерыкі, Афрыкі), марскія ракавіны, таксама геалагічныя.

Другі абласны музей – Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі – перадаў каля 5000 апісанняў прадметаў. Сярод іх большасць складаюць абразы XVI–XX стст., элементы царкоўнага аздаблення і прадметы культу (праваслаўныя, каталіцкія). Вялікую цікавасць сярод перададзеных апісанняў прадметаў уяўляюць каменныя яйкі, якія ўваходзілі ў склад пахавальнага інвентара Верхняга Пабужжа X–XIII стст.; вадаліў XIII ст. у выглядзе коннага рыцара; ватыўныя знакі XVIII ст.; комплекс памятных медалёў, прысвечаных хрышчэнню, а таксама персонам і падзеям з гісторыі хрысціянскай царквы; вялікая калекцыя паштовак з выявамі, у тым ліку культавых пабудоў; фатаграфіі святароў; друкаваныя выданні (кнігі, газеты, часопісы) першай паловы – сярэдзіны XX ст., якія адлюстроўваюць стаўленне да рэлігіі ў гэты час і суіснаванне рэлігіі і атэізму; цікавы комплекс сярэднеазіяцкіх амулетаў і татэмных знакаў; мугіры – мусульманскія абразы з выявамі культавых пабудоў ці вытрымак з Карана, па якіх можна ў тым ліку прасачыць узаемапранікненне і ўзаемаўплыў беларускай і татарскай культур.

Сярод прадметаў з музеяў раённага падпарадкавання, інфармацыя аб якіх знаходзіцца ў Дзяржаўным каталогу, таксама сустракаецца нямала цікавага. Напрыклад, у ДКМФРБ перададзены ўнікальныя дакументы з фондаў Музея Максіма Багдановіча ў Гродне, па якіх можна прасачыць гісторыю сям'і Адама Ягоравіча Багдановіча за 1890–1947 гг. Гэта пасведчанні аб нараджэнні старэйшага брата Максіма Багдановіча – Вадзіма ў 1890 г., сына А. Я. Багдановіча і А. П. Волжынай – Аляксандра ў 1899 г., сыноў А.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я. Багдановіча і А. А. Мякоты: Паўла ў 1901 г., Мікалая ў 1903 г., Аляксея ў 1905 г., Вячаслава ў 1908 г. Пасведчанне аб шлюбе А. Я. Багдановіча і А. П. Волжынай (сястры жонкі М. Горкага) 09.02.1899 г. у Ніжагародскай Трохсвяціцельскай царкве. Таксама выпісы з метрычных кніг і пасведчанні аб смерці: Аляксандры Паўлаўны Багдановіч (у дзявоцтве – Волжынай) за 1899 г., Аляксандра Багдановіча за 1902 г., Вадзіма Багдановіча за 1908 г., Рамана Багдановіча за 1917 г., Вячаслава Багдановіча за 1940 г., Адама Ягоравіча Багдановіча за 16.04.1940 г., Аляксандры Апанасаўны Багдановіч (у дзявоцтве – Мякоты) за 9.09.1947 г.

Музеем таксама перададзены апісанні прадметаў, якія тычацца літаратурнай спадчыны Дануты Бічэль-Загнетавай – паэтэсы, ураджэнкі Гродзеншчыны; дакументы, выдадзеныя В. У. Быкаву падчас яго працы ў рэдакцыі абласной газеты «Гродзенская праўда».

Ваўкавыскім ваенна-гістарычным музеем імя П. І. Баграціёна быў перададзены шэраг апісанняў музейных прадметаў, звязаных з падзеямі Айчыннай вайны 1812 г.: графічныя аркушы пачатку XIX ст. Расійскай імперыі з выявамі П. І. Баграціёна, яго жонкі княгіні Кацярыны Паўлаўны і знакамітых дзеячаў эпохі Аляксандра I; графічныя творы, прысвечаныя галоўным падзеям вайны 1812 г.; графічныя аркушы пачатку XIX ст. Французскай Рэспублікі, сярод якіх вылучаюцца каранацыйныя партрэты 1805 г. імператара Напалеона I і яго жонкі імператрыцы Жазефіны. Музеем перададзены апісанні формы рускіх і французскіх вайскоўцаў першай паловы XIX ст., агнястрэльнай і халоднай зброі еўрапейскіх армій XVI–XX стст.

У ДКМФРБ зарэгістравана таксама вялікія калекцыя нумізматыкі і археалогіі. Сярод найбольш каштоўных прадметаў можна назваць сярэбраны польскі дынар XI ст., медальён XII–XIII стст. з выявай святога Дзмітрыя Салунскага, які лічыўся заступнікам воінаў, і фрагмент каменнага абразка XII ст. з надпісам «ГВРИ/Л».

Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей створаны на базе школьнага літаратурна-краязнаўчага музея, які заснаваў настаўнік беларускай мовы і літаратуры Белакоз Алесь Мікалаевіч. Першымі экспанатамі яго сталі лісты знакамітых пісьменнікаў, мастакоў, дзеячаў навукі і культуры да А. М. Белакоза і вучняў Гудзевіцкай школы, таксама рукапісы твораў беларускіх літаратараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рарытэтнай з’яўляецца калекцыя кніг музея, па якой можна прасачыць развіццё беларускай мовы і літаратуры ў канцы XIX – сярэдзіне XX ст. Сапраўды ўнікальныя кнігі аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры Ф. Багушэвіча – зборнік вершаў «Smyk bielaruski», выдадзены ў Вільні ў пачатку XX ст. пад псеўданімам Сымон Рэўка з-пад Барысава і зборнік вершаў «Dudka bielaruskaja», выдадзены ў 1896 г. у Кракаве пад псеўданімам Мацей Бурачок.

У пачатку XX ст. перавыдаецца і друкуецца вялікая колькасць твораў беларускіх аўтараў, што бачна па выданнях, якія захоўваюцца ў фондах музея: «Hapon» (1908), «Scerouskije dazynki» (1910) В. Дуніна-Марцінкевіча; зборнік «Skrypka Biełaruskaja» (1918) Цёткі; зборнік «Ostatnie nowele» (1921) Элізы Ажэшкі. Акрамя вышэйадзначаных твораў, у музеі захоўваюцца літаратурныя творы 1910–1920-х гг. Ядвігіна Ш., Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, З. Бядулі, А. Гаруна, М. Чарота і інш.

Пачатак XX ст. быў вызначальным у пытанні нармалізацыі беларускай мовы, стварэння граматыкі. У Дзяржаўным каталогу зарэгістраваны музейны прадмет – кніга «Pierszaje czytannie» («Першае чытанне для дзетак-беларусаў») Цёткі (Алаізы Пашкевіч), выдадзены ў 1906 г. у Пецярбургу; падручнік, выдадзены ў 1918 г. у Вільні – «Nowy lementar dla bielaruskich dzietak». У 1920-х гг. беларуская мова атрымала статус дзяржаўнай, былі створаны падручнікі на беларускай мове для школ па ўсіх прадметах. У Дзяржаўным каталогу зарэгістраваны падручнікі 1920–1930-х гг.: «Батаніка» 1924 г.; «Фізічная геаграфія» 1933 г.; «Беларуская мова. Граматыка і правапіс» (падручнік для яўрэйскай школы на беларускай мове) 1934 г.; «Беларуская мова. Заданне пятае. Завочныя курсы рэдактараў калгасных і брыгадных насценгазет» 1937 г.; «Анатомія і фізіялогія чалавека» 1939 г.

У 1920–1930-я гг. актыўна вывучаецца і збіраецца беларускі фальклор – са збораў музея ў Дзяржаўным каталогу прадстаўлены кнігі: «Тыпы Палесься. Абразкі і легенды» 1924 г.; «Bielaruskija narodnyja piesni» 1930 г.

Унікальным археалагічным прадметам з фондаў музея ў Дзяржаўным каталогу з’яўляецца каменны рукамыйнік дахрысціянскага часу, створаны да 988 г., на якім выбіты надпіс: XI P.P.D.

Іўеўскім музеем нацыянальных культур у Дзяржаўны каталог былі перададзены рытуальныя іудзейскія рэчы: ханукіі, тфіліны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кеара – талерка для свята Песах, куфель для кідуша, якія адлюстроўваюць жыццё асноўнага насельніцтва мястэчка да сярэдзіны XX ст.

З мастоўскага музея «Лес і чалавек», акрамя манет і абразоў, была перададзена інфармацыя і аб фатаграфіях, якія даюць уяўленне пра мястэчка Масты і яго жыхароў у 1930-я гг. Са Слонімскага раённага краязнаўчага музея імя І. І. Стаброўскага сярод іншых перададзеных прадметаў можна вылучыць апісанні некаторых асабістых рэчаў Мікалая Уласіка, а таксама часткі драўлянага вадаправода, пракладзенага ў Слоніме на тэрыторыі палацавага комплексу слонімскага старасты Міхала Казіміра Агінскага. Сярод апісанняў прадметаў, перададзеных са Смаргонскага гісторыка-краязнаўчага музея, можна пабачыць карту Рэчы Паспалітай з межамі яе падзелаў, створаную брытанскім каралеўскім картографам Джэймсам Уайлдам малодшым у 1841 г.; карты Смаргоні, Ашмян і Ракава 1920–1930-х гг.; некаторыя нумары часопіса «Великая война в образах и картинах», прысвечанага падзеям Першай сусветнай вайны.

Усё вышэйзгаданае – толькі невялікая частка таго, што знаходзіцца ў фондах гродзенскіх музеяў. Усе гэтыя прадметы вартыя не толькі захавання ў музеі і ўліку ў Дзяржаўным каталогу, але і ўважлівага і дэтальнага вывучэння. На жаль, часта па розных прычынах музейныя прадметы застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў, і менавіта Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь можа стаць добрым адпраўным пунктам для далейшых даследаванняў.

---

1. *Пастанова* Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 730 ад 10.06.2006 г. (рэдакцыя ад 7.10.2011 г.) «Палажэнне аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» // Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.pravo.by/main.aspx?guid= 3871&p0 =C21101339&p2={NRPA}. – Дата доступу: 30.06.2012.

2. *Колькасць* прадметаў, зарэгістраваных у Дзяржаўным каталогу Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь // Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://dkmf.by/news/view-66.html? day_post=&month_post=&year_post=. – Дата доступу: 30.06.2012.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ